

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2023 года*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*
## 10 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Запішыце насупраць змешчаных у табліцы слоў прапушчаныя ў іх спалучэнні галосных літар.

*Максімальная колькасць балаў – **7**.*

**Заданне 2.** Спалучыце словы з левага слупка з іх значэннямі ў правым слупку, напрыклад, А1Б2В3Г4Д5Е6.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Словы | Значэнні слоў |
|---|---|
| *А. Братавая* | 1. Дзядзькава жонка |
| *Б. Ятроўка* | 2. Жонка аднаго брата ў адносінах да жонкі другога брата |
| *В. Братаніца* | 3. Жончына сястра |
| *Г. Дзядзіна* | 4. Жонка брата |
| *Д. Цешча* | 5. Пляменніца |
| *Е. Швагерка* | 6. Якая знаходзіцца ў сваяцтве па дзеду ці бабцы з дзецьмі іх сыноў або дочак; дваюрадная |
| | 7. Жончына маці |

**Заданне 3.** Беларуская мова валодае разнастайным наборам суфіксаў, якія пры іх далучэнні да асноў якасных прыметнікаў могуць надаваць апошнім дадатковую афарбоўку, вельмі тонка перадаючы розныя эмацыянальныя або ацэначныя нюансы зместу.

Паспрабуйце раскрыць гэты патэнцыял беларускай мовы і ўтварыце як мага большую колькасць формаў прыметнікаў, ужываючы для гэтага розныя суфіксы ацэнкі, ад асновы прыметніка *тонкі*.

**Заўвага.** Утвораныя формы павінны адпавядаць норме літаратурнай мовы і быць простымі па структуры (мець толькі адну аснову).

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*



**Заданне 4.** З кожнага рада выберыце нумар правільнага варыянта словаформы (словаформаў) з прапанаваных у дужках. Адказ запішыце ў выглчдзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В3Г1Д2Е3).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

А: У (запісе$^1$, запісу$^2$, запісі$^3$) няправільнага дробу была зроблена грубая памылка.

Б: Пры працяглай (засухі$^1$, засухе$^2$, засусе$^3$) многія расліны могуць загінуць.

В: Чым больш прыгажосці адкрыецца маленькаму чалавеку ў дзяцінстве, тым (паўнейшым$^1$, найпаўнейшым$^2$, паўней$^3$) будзе яго дарослае жыццё.

Г: У Белавежскай пушчы дрэва-хмызняковай расліннасці да (дзевяцьсот$^1$, дзевяцісот$^2$, дзевяціста$^3$) відаў.

Д: Да пункта прызначэння трэба было даставіць (пяцідзесяці трох$^1$, пяцьдзясят трох$^2$, пяцьдзясят тры$^3$) пасажыр(-ы, -аў).

Е: Я тут параілася (тым з сім$^1$, з сім-тым$^2$, сім з тым$^3$) наконт кватэры.

**Заданне 5.** Прачытайце тэкст і сцверджанні да яго. У графе “правільна” табліцы насупраць правільных сцверджанняў пастаўце “плюс”, насупраць няправільных сцверджанняў пастаўце “мінус”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Як і Янка Купала і Максім Багдановіч, Якуб Колас прыйшоў у жыццё, каб сказаць: “Вось мы – беларускі народ! Вось у чым наша веліч і несмяротнасць. Вось наш нацыянальны геній, без якога ты, вялікі свет, быў бы нашмат бяднейшы. А таму ра(с,сс)тупіцеся, пасуньцеся трохі, мілыя суседзі, мы зоймем сваё пад гэтым небам месца. Сваё месца ў бясконцай гісторыі чалавецтва. Мы маем на гэта месца права”. Усё гэта ў творчасці Якуба Коласа сцверджана, наказана і даказана бліскуча: хто мы і што мы і за што нас трэба паважаць у свеце. *Сённяшняе прачытанне Якуба Коласа дасць магчымасць шмат у чым па-іншаму глянуць на жыццё на гісторыю беларусаў лепш і глыбей зразумець іх душу характар светапогляд адчуць і ўбачыць найвялікшы цуд створаны геніем народа – яго мову.*

*Паводле Н. Гілевіча*

**Заданне 6.** Вызначце ў кожнай з трох прапанаваных груп сказаў трэці лішні сказ з улікам наступных абмежаванняў: віду сродкаў сувязі галоўнай і даданай часткі (I); сінтаксічнай функцыі злучальнага слова (II); віду даданай часткі (III). Патлумачце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

I. 1) Як паважаеш ты суседа, цябе шануе так сусед *(Я. Непачаловіч)*.

2) Няма на свеце справы больш пачэснай, як быць народу творцам і слугой *(А. Звонак)*.

3) Прыпомнілася, як у адзін з пасляваенных гадоў на збавенне людзям вельмі добра ўрадзілі грыбы *(Я. Галубовіч)*.

II. 1) Блізкасць пушчы адчуваецца не толькі над ракой, берагі якое завалены падрыхтаванай для сплаву драўнінай, але і ў самім гарадку *(Я. Брыль)*.

2) Падарункі складвалі ў вялізны плецены кош, які нехта з валачобнікаў насіў на рэмені цераз плячо *(С. Давідовіч)*.

3) Іду з вуліцы ў вуліцу, як з пакоя ў пакой, і скрозь пазнаю знаёмыя абліччы сяброў і тысячы людзей, з якімі яшчэ не паспеў пагаварыць і пасябраваць *(С. Грахоўскі)*.

III. 1) Карніз быў такі вузкі, што па ім не прабегла б і мыш *(У. Караткевіч)*.

2) Сонейка прыгравала так, што ад зямлі аж пара ішла *(У. Дубоўка)*.

3) Рысы твару былі выразныя, рэзка акрэсленыя, такія правільныя, што згадзіліся б як узор нават вялікаму скульптару *(У. Караткевіч)*.

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

– Погодите, я сам скажу, что я думаю. Я думаю, что если бы дремлющего в человеке зверя можно было остановить угрозою, все равно, каталажки или загробного воздаяния, высшею эмблемой человечества был бы цирковой укротитель с хлыстом, а не жертвующий собою проповедник. Но в том-то и дело, что человека столетиями поднимала над животным и уносила ввысь не палка, а музыка: неотразимость безоружной истины, притягательность её примера.

*По Б. Пастернаку*

**Заданне 8.** Уважліва прачытайце ўрывак з мастацкага тэксту. Якія з пералічаных ніжэй літаратуразнаўчых тэрмінаў і паняццяў можна выкарыстаць пры яго характарыстыцы. Запішыце гэтыя тэрміны ў табліцу і дайце ім азначэнне.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

*Ёсць у сусвеце планета Зямля.*
*Ёсць на Зямлі той краіна адна,*
*А ў той краіне – прыстанішча, дзе*
*Сэрца званчэйшыя песні вядзе.*

*Максім Танк*

**Літаратуразнаўчыя тэрміны і паняцці:** актава, амфібрахій, анафара, байка, белы верш, дактыль, пейзажная лірыка, метафара, проза, рыфма, эпілог.

**Заданне 9.** Ці добра ведаеце творчасць Максіма Танка і Максіма Гарэцкага? Вызначце, якія з прыведзеных ніжэй фактаў адносяцца да жыцця і творчасці гэтых песняроў, а таксама праўдзівасць гэтых фактаў. Запоўніце адпаведныя слупкі табліцы ў бланку адказаў.

***Узор:***

*Факты:*

*...*

*7. Дзеянне аповесці “Непаўторная вясна” адбываецца ў 1941–1945 гады.*

*8. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Глінішча.*

*9. Заснаваў літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”*

*...*

| *Іван Шамякін* | | *Іван Мележ* | | *Не адносіцца да жыцця і творчасці ні І. Шамякіна, ні І. Мележа* |
|---|---|---|---|---|
| *праўдзівы* | *памылковы* | *праўдзівы* | *памылковы* | |
| | *7* | *8* | | *9* |

*Каментарый: запоўненая такім чынам табліца сведчыць пра наступнае:*

*І. Шамякін з’яўляецца аўтарам аповесці “Непаўторная вясна”, але факт утрымлівае памылку (дзеянне адбываецца ў 1939–1940 гады);*

*І. Мележ сапраўды нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Глінішча;*

*ні І. Шамякін, ні І. Мележ не мелі дачынення да заснавання “Маладняка”.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

***Факты:***

1. Вёска Малая Багацькаўка знаходзіцца на Віцебшчыне.
2. Яўген Скурко нарадзіўся ў Нарачанскім краі.
3. Зборнік “Вянок” выйшаў у 1914 годзе.
4. Апавяданне “У лазні” выйшла ў 1913 годзе ў газеце “Наша ніва”.
5. Першая кніга “Росквіт зямлі” выйшла ў свет, калі пісьменніку было 16 гадоў.
6. Кніга “На этапах” выдадзена ў 1936 годзе ў Мінску.
7. У 1926–1928 гадах загадваў кафедрай беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельгасакадэміі.

**Заданне 10.** Напішыце тэкст літаратуразнаўчага або гісторыка-літаратуразнаўчага характару, абавязкова ўключыце як мага болей пералічаных ніжэй слоў і словазлучэнняў (пададзены ў алфавітным парадку праз кропку с коскай): *аповесць; вечны вобраз; грамадзянскасць літаратуры; гуманізм; жанр; Максім Гарэцкі; падтэкст.*

Патлумачце, для каго напісаны ваш тэкст, дзе ён будзе размешчаны.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*